ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА
СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 28 (2002) ● Чацвер, 16 кастрычніка 1975 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выходзіць з 1935 г.

**ЮНАКІ І ДЗЯЎЧАТЫ! НАСТОЙЛІВА АВАЛОДВАЙЦЕ МАРКСІСЦКА - ЛЕНІНСКІМ ВЎЧЭННЕМ, ДАСЯГНЕННЯМІ НАВУКІ, ТЭХНІКІ І КУЛЬТУРЫ! ПАМНАЖАЙЦЕ СЛАЎНЫЯ РЭВАЛЮЦЫЙНЫЯ, БАЯВЫЯ І ПРАЦОЎНЫЯ ТРАДЫЦЫІ САВЕЦКАГА НАРОДА! АЗНАМЯНУЙЦЕ XXV З'ЕЗД КПСС ЎДАРНАЙ ПРАЦАЙ І ВЫДАТНАЙ ВУЧОБАЙ!**

**(З Заклікаў ЦК КПСС да 58-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі).**

# САЦЫЯАІСТЫЧНЫЯ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ

## КАЛЕКТЫВУ БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

## ПА ДАСТОЙНАЙ СУСТРЭЧЫ XXV З'ЕЗДА КПСС,

## У ДАДАТАК ДА ПРЫНЯТЫХ НА 1975 ГОД САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ

**З вялікім задавальненнем калектыу Беларускага дзяржаунага ордэна Працоунага Чырвонага Сцяга універсітэта імя У. І. Леніна успрыняу рашэнне сакавіцкага (1975) Пленума ЦК КПСС аб скліканні чарговага XXV з'езда Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. Гэта вестка знайшла гарачы водгук у прафесарска - выкладчыцкага саставу, студэнтау, аспірантау, працоуных і служачых універсітэта і выклікала прыліу новай працоунай і палітычнай актыунасці у справе далейшага паляпшэння якасці падрыхтоукі высокакваліфікаваных спецыялістау, развіцця навуковых даследаванняу і камуністычнага выхавання студэнцкай моладзі.**

**У адказ на рашэнні сакавіцкага (1975) Пленума ЦК КПСС і пастановы ЦК КПСС «Аб сацыялістычным спаборніцтве за дастойную сустрэчу XXV з'езда КПСС» калектыу Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна бярэ на сябе наступныя, дадатковыя да прынятых на 1975 год, сацыяпістычныя абавязацельствы:**

1. Арганізаваць глыбокае вывучэнне і абмеркаванне у калектывах факультэтау, кафедр, лабараторый, аддзелау і служб, на усіх курсах і у акадэмічных групах матэрыялау сакавіцкага (1975) Пленума ЦК КПСС, пастановы ЦК КПСС «Аб сацыялістычным спаборніцтве за дастойную сустрэчу XXV з'езда КПСС» і узяць іх за аснову сваёй дзейнасці па далейшаму удасканаленню стылю і метадау работы ва універсітэце.

2. Выдаць і падрыхтаваць да выдання 42 манаграфіі, 17 падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў.

3. Распрацаваць і удасканаліць 10 спецкурсау, 15 лабараторных работ, падрыхтаваць 60 навукова-метадычных дакладаў.

4. Абсталяваць тэхнічнымі сродкамі навучання аудыторыю № 507 кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтау і кабінет кафедры рускай мовы факультэта па навучанню замежных студэнтау.

5. З мэтай аказання дапамогі маладым выкладчыкам у павышэнні іх кваліфікацыі арганізаваць пастаянна дзейнічаючыя семінары.

6. Арганізаваць і правесці навукова-метадычны семінар па праблемах выкладання хіміі у сярэдняй школе.

7. Аформіць 100 заявак на мяркуемыя вынаходствы, атрымаць 30 аутарскіх пасведчанняу, 3 замежныя патэнты.

8. Укараніць у народную гаспадарку 6 навукова-даследчых работ.

9. Выдаць 400 навуковых работ.

10. Датэрмінова, да 10 снежня, сканструяваць, вырабіць і укараніць вопытную партыю ўстановак па аутаматычнаму вызначэнню тэмпературы ўспышкі нафтапрадуктау.

11. Давесці лік прыродазнаўча-прыкладных навукова-даследчых работ, на якія будуць пададзены аутарскія заяукі на адкрыцці, да 25% ад агульнага ліку тэм.

12. Павялічыць колькасць студэнтау, удзельнічаючых у навукова-даследчай рабоце, на 5% вышэй прынятых абавязацельствау на 1975 год.

13. Арганізаваць студэнцкі навуковы гурток па вывучэнню культуры Савецкай Беларусі.

14. Падрыхтаваць для дэманстрацыі на Выстауцы дасягненняу народнай гаспадаркі дзве прылады.

15. Правесці навуковую канферэнцыю выкладчыкау на тэму «Ад з'езда да з'езда».

16. Заключыць 2 дагаворы аб датэрміновым комплексным навукова-тэхнічным супрацоўніцтве

17. Давесці лік членаў ВОИР да 500 чалавек.

18. Перавыканаць планавыя заданні 1975 года работы бібліятэкі па асноўных паказчыках на 1%.

19. Да 1 лістапада 1975 г. арганізаваць работу філіяла бібліятэкі для студэнтау аддзялення радыёфізікі фізічнага факультэта (у раёне пасёлка Шчамысліца).

20. Да 1 лістапада 1975 года выканаць гадавы план будаўніча-мантажных работ.

21. У 1975 годзе перавыканаць план будаўніча-мантажных работ на 7%, план уводу асноуных фондау — на 1%.

22. Сэканоміць фонд зарплаты па тэхагляду на 500 рублёў.

23. Выканаць план выданняу (па выдавецтву) на два дні раней, чым было намечана ў сацабавязацельствах на 1975 год.

24. План па выпуску і рэалізацыі друкаванай прадукцыі (па друкарні) выканаць на пяць дзён раней, чым было намечана у сацабавязацельствах на 1975 год.

25. Падрыхтаваць 15 кандыдатаў у майстры спорту і спартсменаў першага разраду і 50 спартсменаў масавых разрадау.

26. Арганізаваць 16 новых цыклау лекцый пад рубрыкай «XXV з'езду КПСС — дастойную сустрэчу», з іх на грамадска-палітычныя тэмы — 8, і прыродазнауча-навуковыя—8.

27. Правесці дэкаду шэфскай грамадска карыснай дзейнасці студэнтау у падшэфных домакірауніцтвах, школах, ГПТВ Кастрычніцкага раёна, калгасах і саўгасах Дзяржынскага, Стаўбцоўскага, Нясвіжскага і Клецкага раёнау, арганізаваць ў дадатак не менш 5 выездау студэнтау у падшэфныя арганізацыі.

28. Стварыць і накіраваць на ударнае будаўніцтва 2 зімовыя студэнцкія будаўнічыя атрады колькасцю 80 чалавек з ліку найбольш падрыхтаваных байцоу студэнцкіх будаунічых атрадау.

29. У ходзе падрыхтоукі і удзелу камсамольцау і моладзі універсітэта у Ленінскім заліку арганізаваць сацыялістычнае спаборніцтва у камсамольскіх арганізацыях вучэбных груп за права падпісаць рапарт XXV з'езду КПСС.

Рэктар
Беларускага дзяржаўнага
універсітэта імя
У. І. Леніна,
прафесар
**У. М. СІКОРСКІ.**

Сакратар парткома,
дацэнт
**Т. Я. ДУДАРАВА.**

Старшыня мясцкома,
дацэнт
**І. Г. РОДЗІН.**







*У пачатку кастрычніка універсітэт наведала Цола Драгойчава — ганаровы госць III фестывалю дружбы моладзі СССР і НРБ, член палітбюро ЦК БКП, старшыня Усенароднага камітэта балгара-савецкай дружбы.*

*Госці з Балгарыі наведалі аудыторыю савецка-балгарскай дружбы, кафедру гісторыі КПСС прыродазнаучых факультэтау, усклалі кветкі да Памятнага знака.*

*Фота Д. Прэса і Т. Петрашкевіч.*

# ПА БДУ

**Учора, 15 верасня, у актавай зале БДУ прайшоу агульнауніверсітэцкі партыйны справаздачна-выбарны сход. Падрабязна аб яго рабоце будзе расказана у наступным нумары нашай газеты.**

* * *

**17 верасня адбудзецца XXVI справаздачна-выбарная камсамольская канферэнцыя.**

* * *

**9—10 кастрычніка у БДУ праходзіла Рэспубліканская навукова-метадычная канферэнцыя «Метадалагічныя пытанні удасканальвання выкладання палітычнай эканоміі».**

* * *

**13 кастрычніка на пасяджэнні рэктарата БДУ былі падведзены вынікі навукова-даследчай работы за пяцігодку. З дакладам выступіу прарэктар БДУ па навуковай рабоце прафесар Л. В. Валадзько.**

**Начальнік вучэбнага аддзела В. С. Далгарукаў праінфармавау членау рэктарата аб пачатку навучальнага года і індывідуальных планах і планах работы кафедр.**

# XXV З'ЕЗДУ КПСС — ДАСТОЙНУЮ СУСТРЭЧУ!

## ПЕРШЫ ПРАЦОЎНЫ

Загадчык лабараторыі сказау коратка: «Заутра паедзеце на уборку бульбы». У дэканаце распытау падрабязней—еду са студэнтамі I курса у саугас імя Мічурына Чэрвеньскага раёна. Семдзесят рабят з трох груп факультэта прыкладной матэматыкі, учарашнія абітурыенты, якія паспелі праслухаць некалькі лекцый па матэматычнаму аналізу. Апошняга аказалася дастаткова, каб вестка аб адпраўцы на бульбу была сустрэта з вялікай радасцю.

У дапамогу сабе бяру двух студэнтау V курса. 13 верасня. Кароткае знаёмства з рабятамі — і праз дзве гадзіны мы ужо у саугасе.

Рудня — вялікая вёска з двухпавярховым будынкам праулення, бальніцай, сталовай, магазінам і маленькім клубам. У вёсцы, як сведчыць мемарыяльная дошка на адным з дамоу, у гады Вялікай Айчыннай вайны базіраваліся Чэрвеньскі падпольны райком партыі і штаб партызанскай брыгады «Разгром».

Дырэктар саўгаса Яуген Сяргеевіч Жыгараў намаляваў нам радужныя перспектывы жыцця у саугасе. Але радасць наша была заўчаснай. Саўгас быў не гатовы да прыёму студэнтаў.

Пасля упартых «баёў» з адміністрацыяй саугаса за нармальны быт студэнтау усё ж давялося адну з груп адправіць на эксперыментальную базу «Новыя Зелянкі».

Нарэшце усе арганізацыйныя пытанні былі вырашаны. Пачаліся працоуныя будні. Умовы працы былі цяжкімі. Камбайны рухаліся у воблаках пылу, па зямлі якая дауно не бачыла дажджу. Але скарг не было. Рабяты стараліся рабіць усё, каб выканаць і перавыканаць нормы. Здавалася, яны больш, чым механізатары, перажывалі за поспех справы.

Першакурснікі, гэтыя учарашнія школьнікі, здзівілялі сваёй арганізаванасцю і дысцыплінаванасцю. У гэтым была вялікая заслуга стараст груп Валодзі Цібароўскага і Валодзі Шульгана.

Упэўнены, месяц сельгасработ для станаулення студэнцкай групы значыць больш, чым месяцы вучобы. Для многіх — гэта першая праверка самастойнасці працай. Паусядзённая працоуная дзейнасць збліжае рабят, фарміруе калектыу.

Не заўважылі, як прайшоу месяц. Скончыўся першы працоўны семестр. Студэнты аказалі калгаснікам значную дапамогу — убралі ураджай з плошчы 120 га. Убралі каля 1500 т бульбы.

Першы экзамен вытрыманы, а наперадзе цяжкія, але цікавыя і захапляючыя гады вучобы. Поспехау вам, першакурснікі!

А. КУЛАКОЎ.



На палетках Міншчыны — другакурснікі факультэта журналістыкі. Наперадзе — Н. Лугавая і Л. Мягчыла. Фота А. Лабады.

## ГЕКТАРЫ ПЕРШАКУРСНІКАЎ

Ледзь зніклі з калгасных сядзіб лозунгі «Не пакінем у полі ніводнага зерня!», як іх месца заняу новы заклік «Радзіме — «другі хлеб!». У гэтай важнай справе — уборцы бульбы — працаунікам вёскі па добрай традыцыі штогод дапамагаюць вучні школ, рабочыя прамысловых прадпрыемствау і, вядома ж, студэнты ВНУ.

Нам, першакурснікам факультэта журналістыкі, давялося працаваць у дзвюх гаспадарках Мінскага раёна — у саугасе «Рагоўскі» і на палетках птушкафабрыкі «Зялёны Луг».

Усе мы усведамлялі важнасць сваёй работы і таму імкнуліся выконваць яе на «выдатна».

С. САСІМ.

## КАЛІ СПРАВА НА ЎСІХ АДЗІНАЯ...

Абед быу смачны.

— Пальцы, апячэце! — смеючыся, пакрыквалі дзяучаты-паварыхі на нецярплівых, што ухітраліся схапіць гарачы дранік прама з патэльні.

— Пачакайце, зараз падсмажым апошнія дранікі і будзем даваць дабаўку.

Утульная сталоўка — дарэчы, тут яе называюць не інакш, як рэстаран «Журналінка», — адпрауны пункт. Дапілі малако — і на поле.

Сціхла удалечыні звонкагалоссе, а я усё чытала насценгазету «бульбянога атрада» «На ломшынскіх гонях». Веска Ломшына саўгаса імя Тэльмана Мінскага раёна на кароткі тэрмін стала другім домам для студэнтау IV курса факультэта журналістыкі. Другі дом — не перабольшанне. Чацвёртакурснікі выдатна акліматызаваліся, прыжыліся. Раз-пораз ля «Журналінкі» наладжваюцца імправізаваная эстрада і танцы. А у выхадныя дні — хто малюе чарговую насценгазету, хто дапамагае па гаспадарцы ломшынскім адзінокім старым абс сем'ям ветэранау вайны Але асноуны клопат, якому прысвечаны і газета, і спрэчкі за вячэрай, і сходы, — гэта праца на бульбяным полі.

...Вось яна, важкая, крамяная, то буйная, прыгожая, ледзь змяшчаецца у руцэ, то лёгкая, сама у далонь просіцца. Земляны пыл часам адаб'е на ёй незвычайны узор. Вынырне яна з зямлі, нібы та з вады, — чысценькая, гладкая, з барвовымі вочкамі, блісне на сонцы белым бокам. Бульба!

— Вульбу трэба не паэтызаваць. Бульбу трэба збіраць! — безапеляцыйна заявіу рэаліст Міша Дубіцкі, камандзір атрада.

Сапрауды, тут не да прыгажосці, калі цягнуцца за гарызонт разараныя барозны, а ты па строга распрацаванай «тэхналогіі» — нага сюды, вядро туды — няспынна перасоуваешся па паласе.

— Саша, Грыцкевіч! Аднясі!

Хвіліну, дакладней, паухвіліны, пакуль Саша мяняе вядро, можна і адпачыць. А затым — зноу чорная зямля і глухі перастук бульбы.

— Глядзіце, да нас дапамога прыйшла, — вітаюць Лёшу Кастрыкіна, забеспячэнца.

— А з ім — мясцовыя хлопцы!

І святлеюць твары, весялеюць галасы, знікае стома. Адно за другім у кузау трактара перакульвае вёдры камісар Тамара Кудрыцкая. Каго жартам падбадзёрыць, каму дапаможа. Курсавы паэт Валерый Задаля, знешне маўклівы, сур'ёзны, нават за працай аб нечым думае. Мо складае новы верш?

— Кончылі!

Трактар, задаволена пыхнуушы, паварочвае цяжкі, поуны кузау і едзе да буртоу. Ад поля да вёскі працягнууся ланцуг юнакоу і дзяучат. Сустракайце, кухары, працоуных людзей!

С. ШЫДЛОЎСКАЯ.









ссыпае бульбу камандзір Міхаіл ДУБІЦКІ;
калі трактар наступае на пяткі;
Таццяна СКІБІЦКАЯ — адна з лепшых працауніц; на бульбяным полі.
Фота аутара.

«...Дарагія сябры! Дазвольце павіншаваць вас з уступленнем у рады савецкіх студэнтау і пажадаць вам выдатнай вучобы, добрага здароуя...»

вучання студэнты ужо добра валодаюць рускай мовай, а курс «Савецкі Саюз» дапамагае ім больш даведацца аб нашай краіне, яе гісторыі.

## ВУЧУСЯ Ў СССР

Гэтыя словы дэкана падрыхтоучага факультэта М. К. Гарбачова замежныя студэнты слухаюць з вялікай увагай, баючыся прапусціць што-небудзь, хаця наурад ці усё яны разумеюць без перакладчыка. Яны — гэта група юнакоу з Кубы, якім пашанцавала прыехаць на вучобу ў нашу краіну. Цяпер у аудыторыі, дзе праходзіць агульнае знаёмства з працэсам навучання, з выкладчыкамі, яны сядзяць прыціхшыя, але за гэтай знешняй нясмеласцю адчуваецца радасць захаплення. Не пройдзе і тыдня, як паляцяць на радзіму лісты:

«...Вось я і вучуся, як марыу, у Савецкім Саюзе. Гэта — цудоуная краіна... Я ужо ведаю некалькі рускіх слоу. Хутка, думаю, я буду добра размаўляць па-руску...».

Падрыхтоучы факультэт існуе ужо 14 год. Сюды прыязджаюць юнакі і дзяучаты з розных куткоу свету: з Лацінскай Амерыкі, Венесуэлы, Перу, Эквадора, Кубы, МНР, В'етнама, Блізкага Усходу. Усе яны, праявіушыя здольнасці да якой-небудзь навукі, пасля праходжання курса навучання рускай мове і паспяховай здачы экзаменау па іншых дысцыплінах, ідуць вучыцца па выбранай спецыяльнасці у савецкія ВНУ, тэхнікумы, вучылішчы. За дзесяць месяцау вучобы на факультэце маладыя людзі атрымліваюць добрую падрыхтоўку па матэматыцы, фізіцы, хіміі, чарчэнню. Амаль праз тры месяцы з пачатку навучання студэнты ужо добра валодаюць рускай мовай...

Заняткі са студэнтамі праводзяць высокакваліфікаваныя выкладчыкі, для аблягчэння працэсу навучання на факультэце ёсць лінгафонныя кабінеты, клас праграміравання.

Калі празвініць званок з заняткау, аудыторыі хутка пусцеюць, і на факультэце наступае цішыня. Але не, гэта толькі здаецца. Вось аднекуль пачуліся гукі рояля, і дружны хор галасоу падхапіу вясёлую песню. Гэта ідуць рэпетыцыі мастацкай самадзейнасці, у якой з задавальненнем удзельнічаюць амаль усе студэнты падрыхтоучага факультэта.

У вольны час на факультэце арганізоуваюцца цікавыя сустрэчы з выдатнымі людзьмі, музычныя вечары. Студэнты самі выступаюць у школах-інтэрнатах, на прадпрыемствах, расказваюць аб сваёй радзіме, знаёмяцца з жыццём працоунай моладзі у СССР.

Летам, у чэрвені, адбываецца хвалюючая падзея: своеасаблівы экзамен на сталасць. Сёлета 164 замежныя студэнты скончылі падрыхтоучы факультэт і паступілі у ВНУ нашай краіны.

Адны з былых студэнтау ужо самі выкладчыкі там, у сябе на радзіме, іншыя працуюць інжынерамі, урачамі. Але усе яны з удзячнасцю успамінаюць першую савецкую школу — падрыхтоучы факультэт, цудоуных выкладчыкау, сваіх рускіх таварышау, з якімі пасябравалі за гады вучобы.

І. САВЕТКІНА.

# СЛОВЫ ЎДЗЯЧНАСЦІ

У канцы лета у Маскве праходзілаVI Генеральная канферэнцыя Міжнароднай асацыяцыі універсітэтау. Перад яе удзельнікамі выступау народны ансамбль танца «Крыжачок» БДУ.

І вось некалькі дзён назад на імя рэктара нашага універсітэта прыйшло пісьмо арганізацыйнага камітэта канферэнцыі. У ім гаворыцца:

«Паважаны Усевалад Міхайлавіч!

Нацыянальны Арганізацыйны камітэт VI Генеральнай канферэнцыі Міжнароднай асацыяцыі універсітэтау выражае Вам глыбокую удзячнасць за падрыхтоуку і накіраванне у Маскву народнага ансамбля танца «Крыжачок» для выступлення перад удзельнікамі канферэнцыі.

Высокае выканаучае майстэрства ансамбля у многім садзейнічала вялікаму поспеху праведзеных канцэртау, якія з'явіліся яркай дэманстрацыяй савецкай шматнацыянальнай культуры, студэнцкай мастацкай творчасці.

**Член нацыянальнага Арганізацыйнага камітэта, старшыня культурна-масавай камісіі, прарэктар МДУ**
**Ф. М. ВОЛКАЎ.**

**Адказны сакратар культурна-масавай камісіі, дырэктар Палаца культуры МДУ**
**Г. В. ХОДЭС».**

# МАЙМУ МАЛОДШАМУ СЯБРУ

# ПРЫМУШАЙ РОЗУМ ДЗЕЙНІЧАЦЬ

Залічаны! Студэнт! Я — студэнт! І неспакойны, усхваляваны позірк былога абітурыента засвяціуся радасцю, гонарам, шчасцем. Хто з нас, студэнтау, не памятае гэтых цудоуных хвілін! Тады мы з захапленнем малявалі сабе карціны цікавага студэнцкага жыцця, аб якім шмат чулі ад старэйшых сяброу і ў якое гарэлі нецярплівасцю акунуцца самі. І чамусьці менш за усё мы думалі у той момант аб будучых гадах вучобы, аб цяжкасцях, непазбежна узнікаючых перад пачынаючым студэнтам.

Паступіць у ВНУ — гэта, канешне, неабходная, але далёка не дастатковая умова для атрымання вышэйшай адукацыі. З першых жа дзён ВНУ прад'явіць вам свае патрабаванні.

Гэта вам неабходна не толькі для глыбокага вывучэння дысцыплін. Самастойнае мысленне — неад'емная якасць кожнага добрага спецыяліста. І шлях да дасягнення гэтай мэты адзіны: рэгулярна наведвайце лекцыі і практычныя заняткі, акуратна выконвайце хатнія заданні, у цяжкія хвіліны не спяшайцеся звяртацца да «паслуг» падказкі, шпаргалкі, сшытка сябра, а старайцеся дакапацца да ісціны самі. У дзённіку Л. М. Талстога запісаны выпрацаваныя ім для сябе правілы, якія могуць спатрэбіцца і вам:

«Калі што выконваеш, выконвай добра.

Ніколі не даведвайся ў кнізе, калі што-небудзь забыў, а старайся сам прыпомніць.

Прымушай пастаянна розум свой дзейнічаць з ўсёй яму магчымай сілай».

Адна з самых прывабных рыс студэнцкага жыцця — адносная вольнасць часу у студэнта. Не злоужывайце ім, цаніце час. **Умейце правільна распланаваць свой працоуны дзень.** Можа быць і у гэтым вам дапаможа талстоуское правіла:

«Тое, што мяркуеш сабе зрабіць, не адкладвай па прычыне рассеянасці або забавы, але адразу ж, хаця знешне, бярыся за справу. Думкі прыйдуць!»

Падрыхтоуку да семінарскіх і практычных заняткау пастарайцеся раунамерна размеркаваць на кожны дзень тыдня, не дапускаючы перагрузкі у асобныя дні.

**Абавязкова праглядвайце лекцыі.** Калі вы будзеце прыходзіць на лекцыю, засвоіўшы асноуныя думкі, паняцці і значэнні з папярэдняй лекцыі, то гэта аблегчыць вам і успрыманне новага матэрыялу, і запамінанне яго, а, такім чынам, і спросціць падрыхтоуку да экзамена. Я на асабістым вопыце пераканалася, што толькі тыя веды трывалыя, якія атрымліваеш і засвойваеш паступова, на працягу семестра. Можна, канешне, часам і за тры-чатыры дні «вывучыць» які-небудзь прадмет, але за такі ж тэрмін усё амаль і забудзецца. І і ІІ курсы ствараюць фундамент для вывучэння прадметау на старэйшых курсах, для атрымання ведаў па спецыяльнасці. Таму вельмі важна, каб гэты фундамент быў дастаткова трывалым.

**З першых жа дзён уключайцеся ў грамадскую работу групы, курса, факультэта.** У гэтым сэнсе універсітэт дае вам шырокае поле дзейнасці. Пастарайцеся трапіць у жывы струмень камсамольскай работы, удзельнічайце ў самадзейнасці, у рабоце гуртkоў, дзе найлепшым чынам змогуць выявіцца вашы здольнасці. Прычым не трэба чакаць, калі вас запросяць, не адмоучвайцеся у кутках, а самі заяуляйце аб сваіх жаданнях, прапаноувайце свае паслугі. Цяпер, калі мае першыя крокі у ВНУ у мінулым, я вельмі добра разумею, што усю паунату і прывабнасць студэнцкага жыцця можна адчуць толькі тады, калі з галавой акунешся у яго вір. Калі універсітэт стане для вас другім домам, калі пасля заняткау вы не будзеце спяшацца вырвацца з яго сцен, калі вы знойдзеце тут для сябе цікавую справу, то вашы мары аб шчаслівым студэнцкім жыцці стануць явай.

Усяго табе добрага, першакурснік!

**Л. РЭДЗЬКІНА,**
**студэнтка V курса ФПМ.**



Дацэнт Б. П. Міцкевіч чытае лекцыю па гісторыі замежнай літаратуры студэнтам ІІ курса гістарычнага факультэта.
Фота Т. ПЕТРАШКЕВІЧ.

# «ІДЗЁМ ДА З'ЕЗДА»

**У сувязі з падрыхтоукай да XXV з'езда КПСС і XXVIII з'езда КПБ гістарычны факультэт універсітэта прааналізавау і абмеркавау на сваім савеце вынікі працы факультэта за пяць год.**

**Наш карэспандэнт С. Шыдлоуская сустрэлася з дэканам гістфака Іраідай Осіпаунай ЦАРУК.**

**— Раскажыце, калі ласка, на якіх падставах рабіуся аналіз пяцігадовай працы факультэта?**

— Загадзя было зроблена 11 параунаучых табліц з наступнымі паказчыкамі: вынікі апошняй летняй сесіі, вынікі дзяржэкзаменау і абароны дыпломных работ па гадах, вынікі агляду-конкурсу на лепшую акадэмічную групу. Былі прыведзены параунаучая табліца паспяховасці студэнтау па факультэту, аддзяленнях і курсах за пяць год і за кожны год паасобку; параунаучая табліца паспяховасці студэнтау за пяцігодку па прадметах. Па вячэрняй форме навучання былі таксама зроблены табліцы.

# ГАДЫ НАПРУЖАНАЙ ПРАЦЫ

**— Што паказалі лічбы?**

— Па-першае, нашы недапрацоукі і іх прычыны. Так, былі выяулены хібы у рабоце дэканата па арганізацыі вучэбнага працэсу, недагляд з боку кафедр, якія яшчэ недастаткова увагі удзяляюць кантролю за бягучай паспяховасцю. Асабліва падкрэслю той факт, што не усе нашы кафедры надаюць вялікае значэнне метадычнай рабоце, у прыватнасці павышэнню метадычнага узроуню правядзення заняткау у групах. Трэба звярнуць пільную увагу на выпрацоуку аб'ектыунага крытэрыя ацэнкі ведау студэнтау. Справа у тым, што параунаучы аналіз паспяховасці паказау значную розніцу паміж адзнакамі студэнтау I—II і IV—V курсау.

На савеце факультэта па гэтай актуальнай праблеме вялася сур'ёзная размова. Дацэнт М. Ф. Піліпенка выказау слушныя меркаванні аб псіхалагічным бар'еры у першакурснікау як выніку рэзкага пераходу ад школьнай сістэмы да сістэмы вышэйшай навучальнай установы, аб псіхалагічных асаблівасцях студэнтау III курса. Трэцякурснікі, асвоіушыся з методыкай выкладання, пачынаюць расхалоджвацца, менш увагі аддаюць вучобе. Дацэнт М. П. Баранава спынілася на неабходнасці узмацнення работы з пяцікурснікамі, якія часам выпадаюць з поля зроку выкладчыкау і дэканата. Яна ж звярнула увагу членау савета на неабходнасць паляпшэння наведвання заняткау семінара маладога выкладчыка (такі семінар працуе на факультэце ужо другі год).

**— Ну, а якія Вы назавеце станоучыя вынікі аналізу?**

— Факультэт вырас. Паспяхова функцыяніруюць тры аддзяленні, адкрыты дзве новыя кафедры (археалогіі і гісторыі СССР савецкага перыяду).

За два апошнія гады да сябе на працу мы прынялі 16 выкладчыкау, а усяго вучэбны працэс факультэта сёння забяспечваюць 192 выкладчыкі. У 1974—1975 навучальным годзе выдатна працавала факультэцкая метадычная камісія, якую узначальвау дацэнт Д. С. Клімоускі. У цесным кантакце з куратарамі і актывам груп сістэматычна кантралявала бягучую паспяховасць студэнтау акадэмічная камісія. І вось вынік: гістфак па паспяховасці студэнтау займае першае месца ва універсітэце. Па выніках пяці летніх сесіі паспяховасць узрасла з 97,7% да 98,2%. За пяцігодку дыпломы з адзнакай атрымау 101 выпускнік. Гэта для нас найвялікшая радасць.

**— Коратка аб планах на будучае.**

— Перад кафедрамі пастаулена задача яшчэ раз прааналізаваць у бліжэйшыя дні вынікі усіх сесій за пяць год і удзяліць сур'ёзную увагу павышэнню метадычнага і прафесійнага узроуню выкладання дысцыплін.

У плане актывізацыі студэнцкай грамадскасці намечаны сустрэчы выкладчыкау з актывам груп, сход выдатнікау вучобы, сход студэнтау — школьных медалістау, гутаркі з рабятамі, якія прыйшлі у БДУ з вытворчасці, і г. д.

Мы пастараемся прыкласці усе намаганні, каб заваяваныя рубяжы сталі для гістфака не толькі пастаяннымі, але і адпрауннымі для новых дасягненняу.

# САВЕЦКІ ГОСТ

# 50 ГОД ДЗЯРЖАЎНАЙ СТАНДАРТЫЗАЦЫІ Ў СССР

У 1924 годзе па ініцыятыве Ф. Э. Дзяржынскага быу арганізаваны кіруючы цэнтр па стандартызацыі у прамысловасці, а 15 верасня 1925 года Савет Народных Камісарау зацвердзіу палажэнне аб Камітэце па стандартызацыі.

Першым старшынёй Камітэта па стандартызацыі быу В. В. Куйбышау. XVI з'езд партыі указвау на важнасць развіцця стандартызацыі як на адну з умоу паспяховага выканання народнагаспадарчых планау краіны. У гады першых пяцігодак стандарты садзейнічалі асваенню тэхнікі у буйных маштабах і індустрыялізацыі краіны.

Актыуную ролю адыграла стандартызацыя у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Асабліва інтэнсіуна яна развівалася у гады восьмай і дзевятай пяцігодак. У цяперашні час у народнай гаспадарцы СССР дзейнічае звыш 21.000 назвау ГОСТау. Дзяржауны стандарт — гэта нарматыуны акт, які устанаулівае асобыя патрабаванні. Ён уяуляе сабой элемент планавай дысцыпліны. Выкананне патрабаванняу стандарта абавязкова. З дапамогай стандартау рашаюцца арганізацыйныя, эканамічныя і тэхнічныя пытанні вытворчасці. Гэта дазваляе забяспечыць далейшае павышэнне эфектыунасці вытворчасці, тэхнічнага узроуню і якасці выпускаемай прадукцыі, эканомію энергетычных і працоуных рэсурсау. Партыя і урад на сучасным этапе развіцця грамадскай вытворчасці разглядаюць паляпшэнне якасці выпускаемай прадукцыі як адну з важнейшых эканамічных і палітычных задач. Дзяржауная сістэма стандартызацыі з'яуляецца эфектыуным сродкам, садзейнічаючым выкананню гэтай задачы.

У БДУ ў апошнія гады вялікая увага адводзіцца пытанням стандартызацыі. На кафедрах і у лабараторыях усё больш выкарыстоуваюцца розныя ГОСТы пры выкананні навукова-даследчых работ. Для азнаямлення выкладчыкау і навуковых супрацоунікау з тэхнічнай дакументацыяй па стандартызацыі навукова-даследчы аддзел універсітэта арганізавау пры кабінеце НТД збор інфармацыйнай літаратуры па розных пытаннях стандартызацыі і саміх ГОСТау.

Ва універсітэце наладжаны метралагічны нагляд за вымяральнай тэхнікай па забеспячэнню адзінства вымярэнняу пры выкананні навукова-даследчых работ, за правільнасцю эксплуатацыі і зберажэннем прылад і апаратуры. У 1975 годзе універсітэт запланавау праверыць 600 прылад.

Практычную дапамогу кафедрам і лабараторыям аказвае агульнауніверсітэцкая лабараторыя вымяральных прыборау. Яна не толькі кантралюе стан сродкау вымярэння, але адначасова рамантуе няспраўныя прылады. У гэтым годзе ужо уведзена у строй больш 1.350 вымяральных прылад. Станоуча вырашана пытанне тэхнічнага абслугоування вагавай вымяральнай тэхнікі. Зараз аналітычныя і тэхнічныя вагі прыводзяцца у парадак непасрэдна на рабочых месцах.

Пералічаныя мерапрыемствы дазволілі універсітэту пауней выконваць патрабаванні дзяржауных стандартаў.

За добрасумленную працу у арганізацыі стандартызацыі Дзяржауным камітэтам стандартызацыі СССР былі узнагароджаны знакам «За заслугі у стандартызацыі» прарэктар па навуковай рабоце, прафесар Л. В. Валадзько, старшы выкладчык кафедры спектральнага аналізу А. І. Серафімовіч, начальнік навуковага аддзела Г. К. Кузічау і старшы інжынер Г. А. Мужычэнка.

**Е. НЕНАШАЎ,**
**загадчык кабінета НТД.**

# УСЕСАЮЗНАЯ НАРАДА

**Сучасны этап навукова-тэхнічнай рэвалюцыі характарызуецца стварэннем на аснове вылічальнай тэхнікі складаных тэхнічных сістэм, а таксама павелічэннем маштабаў іх вытворчасці і прымянення. Праблема забеспячэння надзейнасці такіх сістэм з'яуляецца найбольш актуальнай навуковай і народнагаспадарчай задачай. Адным з лепшых сродкау рашэння гэтай праблемы з'яуляецца распрацоука і прымяненне метадаў і сродкау тэхнічнага дыягназу на этапах праектавання, стварэння і эксплуатацыі сістэм.**

**Гэтай праблеме была прысвечана III Усесаюзная нарада па тэхнічнай дыягностыцы, якая праходзіла у Мінску з 30 верасня па 2 кастрычніка 1975 года, у рабоце якой прынялі удзел вучоныя больш чым з 60 гарадоў краіны. На нарадзе было заслухана 134 даклады па шасці напрамках:**

**Метады пабудовы тэстау для дыскрэтных абсталяванняў.**

**Дыягнасціраванне дыскрэтных аб'ектау.**

**Дыягнасціраванне бесперапынных аб'ектаў.**

**Метады ацэнкі якасці алгарытмау, сродкау і сістэм дыягнасціравання.**

**Сродкі і сістэмы дыягнасціравання.**

**Метады і сродкі дыягнасціравання у задачах.**

**У рабоце нарады актыуны удзел прынялі многія арганізацыі Мінска.**

**Аддзел дыягностыкі вылічальных сістэм вылічальнага цэнтра БДУ выступіу на нарадзе з трыма дакладамі, якія былі з цікавасцю заслуханы і прыцягнулі увагу многіх спецыялістау розных арганізацый. І гэта не выпадкова, бо вынікі многіх работ, выкананых у аддзеле, укаранёны ў народную гаспадарку нашай рэспублікі і за яе межамі.**

**Н. КАРАТАЕЎ,**
**заг. аддзела дыягностыкі вылічальных сістэм ВЦ.**

# НАВУКОВЫ ЧАСОПІС

Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна — адна са старэйшых навучальных устаноў краіны, кузня навуковых кадраў. Шырокую інфармацыю аб даследаваннях у розных галінах навукі друкуе «Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна». Усяго выходзіць 12 нумароў у год — па 3 нумары у кожнай серыі.

Першая серыя уключае арыгінальныя і аглядныя артыкулы па матэматыцы, фізіцы і механіцы, якія асвятляюць пытанні матэматычнага аналізу, тэорыі функцый і функцыянальнага аналізу, дыферэнцыяльных і інтэгральных ураўненняў, матэматычнай тэорыі кіравання, квантавай тэорыі поля, тэорыі адноснасці, квантавай радыёэлектронікі, цеплафізікі, фізікі паўправаднікоў, тэорыі антэны і многіх іншых напрамкаў матэматыкі, фізікі, механікі.

Для біёлагаў, хімікаў, геолагаў і географаў, безумоўна, прадстаўляе вялікую цікавасць другая серыя, якая асвятляе распрацоўкі тэм гэтых напрамкаў навукі і практыкі.

Для тых, хто цікавіцца актуальнымі пытаннямі грамадскіх навук, прызначана трэцяя серыя. У гэтай серыі пяць асноўных раздзелаў: гісторыя, філасофія, навуковы камунізм, эканоміка, права.

Чацвёртая серыя асвятляе пытанні літаратуразнаўства, мовазнаўства, журналістыкі, педагогікі і псіхалогіі, сістэматычна знаёміць чытача з важнейшымі навуковымі дасягненнямі беларускіх літаратуразнаўцаў, крытыкаў, лінгвістаў, журналістаў, педагогаў і псіхолагаў, ставіць на абмеркаванне дыскусійныя праблемы.

Часопіс разлічаны на прафесараў, выкладчыкаў, аспірантаў і студэнтаў ВНУ, навуковых работнікаў навукова-даследчых інстытутаў, навуковых устаноў і таварыстваў.

Падпісацца на часопіс можна на любым прадпрыемстве сувязі, у Саюздруку, у грамадскіх распаўсюджвальнікаў друку. Усім, хто жыве за межамі Беларусі і жадае падпісацца на «Веснік БДУ імя У. І. Леніна», неабходна выслаць грошы па адрасу: Мінск, вул. Валадарскага, 16. Беларускае падпіснoe і рознічнае агенцтва «Саюздрук». Разліковы рахунак — 44317 у Белканторы Дзяржбанка.

Часопіс у рознічны продаж не паступае.

# І. Е. САНДРЫГАЙЛА



Пасля цяжкай і працяглай хваробы на 24-м годзе жыцця памёр старшы выкладчык кафедры тэорыі функцый механіка-матэматычнага факультэта БДУ Іван Ермалаевіч Сандрыгайла.

І. Е. Сандрыгайла нарадзіўся 1 мая 1952 года у вёсцы Турэйск Краснапольскага раёна Магілёўскай вобласці у сялянскай сям'і. Закончыў сярэднюю школу у 1969 годзе. З 1966 года з'яўляўся членам ВЛКСМ.

У 1969 годзе ён паступіў на матэматычны факультэт БДУ імя У. І. Леніна, які ў 1974 годзе закончыў з адзнакай. З таго часу ён працаваў старшым выкладчыкам навуковай лабараторыі пры кафедры тэорыі функцый. З кастрычніка 1974 года І. Е. Сандрыгайла быў залічаны ў завочную аспірантуру па спецыяльнасці тэорыя функцый і паспяхова здаў усе экзамены кандыдацкага мінімуму.

За гады вучобы І. Е. Сандрыгайла паказаў сябе як выдатны студэнт. Ён пастаянна ішоў наперадзе сваіх равеснікаў, вывучаючы дысцыпліны старэйшых курсаў, рана прыступіў да самастойнай навуковай работы. На IV курсе ім была напісана навуковая работа на вельмі высокім узроўні. Яна была ацэнена як лепшая з прадстаўленых на Усесаюзны конкурс студэнцкіх навуковых работ па секцыі «Тэорыя функцый». Аўтару быў прысуджаны медаль Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і Грамата Вярхоўнага Савета БССР. Прадстаўленая ім на конкурс дыпломная работа была ацэнена як сур'ёзнае навуковае даследаванне, якое стаіць на ўзроўні кандыдацкай дысертацыі. За поспехі ў вучобе і актыўную грамадскую работу у студэнцкім навуковым таварыстве яму была прызначана Ленінская стыпендыя.

Сціплы, чулы таварыш, актыўны камсамолец, І. Е. Сандрыгайла карыстаўся вялікай павагай сярод студэнтаў і супрацоўнікаў факультэта.

Светлая памяць аб І. Е. Сандрыгайле назаўсёды застанецца у сэрцах тых, хто яго ведаў і працаваў разам з ім.

**Супрацоўнікі механіка-матэматычнага факультэта БДУ.**

# ФОТААКНО ПАДАРОЖНІКА



Прыгажун Вільнюс раскінуўся на паўднёвым усходзе Літоўскай рэспублікі, ля сутокі рэк Вільня і Нерыс. Ён вельмі самабытны і непаўторны. Сучаснасць — у новабудоўлях і белакаменных мікрараёнах. А старажытнасць — гэта утульныя рамантычныя вуліцы Старога горада з ажурным спляценнем фасадаў і цесных двароў.

Вільнюсцы і госці літоўскай сталіцы любяць адпачываць на плошчы, якая носіць імя заснавальніка горада, Гедымінаса. Упрыгожанне плошчы — Карцінная галерэя, ля якой праходзяць нядзельныя канцэрты камернай і арганнай музыкі.

Фота **А. Сахашчыка.**



# ПАЧАЛАСЯ ПАДПІСКА

**Першага верасня пачалася падпіска на газеты і часопісы на 1976 год.**

**Запрашаем вас, паважаныя чытачы, своечасова афарміць падпіску на газету «Беларускі універсітэт». Газета выходзіць раз у тыдзень па чацвяргах, цана аднаго нумара—2 капейкі, цана падпіскі на год—1 рубель.**

**Падпісацца на газету можна у грамадскіх распаўсюджвальнікаў друку на факультэтах і кафедрах БДУ.**

**РЭДКАЛЕГІЯ.**

# ЗАПРАШАЕМ!

Калі вы маеце жаданне пазнаёміцца з літаратурай, якая выйшла ў апошнія дні, сістэматычна наведвайце выстаўку новых паступленняў, якая адкрыта у бібліятэцы (галоўны корпус, п. 309).

На выстаўцы экспануюцца айчынныя і замежныя кнігі, часопісы, брашуры, аўтарэфераты дысертацый, выданні, якія працягваюць друкавацца, а таксама інфармацыйна-бібліягра ф і чныя матэрыялы, якія атрымлівае бібліятэка і АНТІ БДУ па усіх галінах ведаў.

Экспануючуюся літаратуру можна заказаць на выстаўцы для работы у чытальнай зале.

Выстаўка працуе у панядзелак, аўторак, сераду, чацвер і пятніцу з 12.00 да 19.00.

У 1-ю і 3-ю пятніцу кожнага месяца — тэматычная выстаўка. Змена экспазіцыі — у суботу.

**Бібліятэка.**

# У АДКАЗ НА ВЫСТУПЛЕННЕ ГАЗЕТЫ

**У нумары 22 ад 12 чэрвеня 1975 года быў надрукаваны крытычны артыкул А. Прастаты «А дзе лаўры!»**

**У артыкуле гаварылася аб тым, што прафком не заўсёды спяшаецца уручаць абяцаныя прызы пераможцам універсітэцкіх конкурсаў мастацкай самадзейнасці, не заўсёды добра плануецца чарговасць рэпетыцый у актавай зале і г. д.**

**У рэдакцыю паступіў адказ старшыні прафкома БДУ А. Жылінскага і дырэктара клуба В. Герасіменкі:**

**«Па палажэнню агляду-конкурсу, надрукаванаму у газеце «Беларускі універсітэт» ад 28 лістапада 1974 года, заахвочваючай паездкай у горад Брэст узнагароджваецца агітбрыгада, а не агіттэатр, заняўшы першае месца. Па рашэнню журы агляду-конкурсу агітбрыгад першае месца заняла агітбрыгада факультэта прыкладной матэматыкі. Для агітбрыгады ФПМ паездка у Брэст будзе арганізавана у лістападзе 1975 года.**

**Па рашэнню журы агляду-конкурсу факультэцкай мастацкай самадзейнасці першае месца заняў факультэт журналістыкі. Ганаровыя граматы і грашовыя прэміі, прадугледжаныя палажэннем, будуць хутка уручаны факультэтам.**

**Праўленне клуба паведамляе, што графік правядзення рэпетыцый у актавай зале быў распрацаваны загадзя. Яго строга прытрымліваліся. Спрэчка, якая узнікла паміж факультэтам журналістыкі і біялагічным факультэтам, тлумачыцца тым, што біялагічны факультэт заняў актавую залу не у свой час. Гэты факт быў адзiным і не можа служыць асновай для аўтарскага сцвярджэння, што паміж факультэтамі былі штодзённыя спрэчкі аб правядзенні рэпетыцый у актавай зале.**

# ВЯСЁЛЫ ПЕРАПЫНАК

**Абітурыенты пісалі...**

Бялінскі сваёй літаратурнай мовай разбіваў усе рэакцыйныя плыні.

Грушніцкі прыставаў да Мэры.

Вялікае уражанне на мяне і мой светапогляд зрабіў раман «Сяржант міліцыі».

Чацкі бяжыць туды, дзе пакрыўджанаму ёсць месцу куток.

**«Адыдзі, увекавечу...»**

Мяркую, што не памылюся, калі нічога не скажу.

Беражыце дрэвы! На іх жылі нашы продкі!

Смех без прычыны — характэрная рыса студэнта пасля сесіі.

Увайсці у гісторыю нялёгка. Уліпнуць у яе — значна прасцей.

Вучыцеся сціпласці ў энцыклапедыі: яна гаворыць аб сабе толькі у апошнім томе.

Пачынаючыя! Прычынай аварыі можа быць асляпляльны бляск перспектывы.

«Адыдзі, увекавечу!» — сказаў скульптар.

Калі ідзе аблава на ваўкоў, першымі разбягаюцца зайцы.

Свая галава, канешне, добра, але свая рука усё ж такі лепей.

**Мясцовая хроніка**

Экскаватаршчык Д. Кротаў, працуючы у раёне Шчамысліцы, раптам адчуў, што яго коўш за нешта зачапіўся. Зацікавіўшыся, Кротаў скокнуў у яму. Якое ж было яго здзіўленне, калі замест скарбу залатых манет XII — XIII стагоддзяў ён убачыў звычайны камень!



**КРАСВОРД**

ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 1. Беларускі савецкі скульптар. 4. Бажаство прыроды у старажытнагрэчаскай міфалогіі. 5. Савецкі спартсмен, у мінулым рэкардсмен свету па бегу. 6. Горад у Комі АССР. 8. Аптычная лінза. 11. Праём у будынку для асвятлення і праветрывання памяшканняў. 13. Заканадаўчы акт вышэйшага органа улады. 15. Аўтар рамана «На заходнім фронце без змен». 17. Найбольшы прыток Волгі. 19. Футбольная каманда першай лігі. 22. Газ. 25. Пласкагор'е у Нігеры. 26. Легендарны старажытнагрэчаскі паэт. 27. Элемент перакрыцця пабудовы.

ПА ВЕРТЫКАЛІ: 1. Гнойнае запаленне тканкі арганізма. 2. Выдатны нямецкі паэт і мысліцель XVIII—XIX ст. 3. Выдатны рускі мастак, падарожнік, грамадскі дзеяч XIX—XX ст. 5. Дзеяч венгерскага і міжнароднага руху. 6. Рыба. 7. Выканаўца ролей у тэатры. 8. Цукрыстая вадкасць, якую выпрацоўваюць пчолы. 9. Раман Ф. Дастаеўскага. 10. Садыст. 12. Хімічны элемент. 14. Філасофская навука аб маралі. 15. Адно з сузор'яў Задыяка. 16. Прытулак, месца адпачынку. 18. Становішча у гульні, калі мяч выходзіць за межы спартыўнай пляцоўкі. 20. Сукупнасць устаноў. 21. Прамысловы раён у ФРГ. 23. Перыядычнае выданне арганізацыі, установы. 24. Адчуванне.

«Белорусский университет»—орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Газета выходзіць па чацвяргах. Тыраж 2.000 экз. Аб'ем—1,5 друк. ар. АТ 05497 Заказ № 1517.

Рэдактар **А. А. ДЗЕРАШ.**

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.